главное в тексте, выделять ключевой смысл, повышает запоминаемость за счет графического изображения (рисунка, чертежа, схемы и т. д.). Немаловажно отметить, что визуальные заметки создаются индивидуально, несут в себе «отпечаток» личности автора, так как выполняются самим обучающимся непосредственно в ходе прочтения или прослушивания учебного материала.

Целесообразность использования скетчноутинга как способа визуализации учебного текста обусловлена тем, чтобы сделать текст доступным для осознания студентами, представить возможность использования дополнительных каналов смыслового восприятия, получить более отчетливое и полное представление о содержании прочитанного.

***Выводы***

Рассмотрев скетчноутинг как способ визуализации текста, отметим, что данный метод восприятия эффективен, открывает дополнительные возможности в процессе обучения студентов, показывает целесообразность использования в педагогической практике, может влиять на результат обучения и решение современных проблем высшей школы. Хотелось бы, чтобы данная методика нашла широкое применение в обучении как инструмент трансформации учебного текста.

**ЛИТЕРАТУРА**

1. *Роуди, М.* Визуальные заметки. Иллюстрированное руководство по скетчноутингу / М. Роуди. — М.: МИФ, 2014. — 224 с.

**УДК 811.161.3’35**

## АСАБЛІВАСЦІ РАБОТЫ ПА АРФАГРАФІІ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ЦЭНТРАЛІЗАВАНАГА ТЭСЦІРАВАННЯ

***Карнiеўская Т. А.***

**Установа адукацыі**
**“Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт”**
**г. Гомель, Рэспубліка Беларусь**

***Уводзіны***

У сучаснай Рэспубліцы Беларусь адной са складаючых паступлення ў вну з’яўляецца паспяховая здача цэнтралізаванага тэсціравання, прычым абавязковым іспытам з’яўляецца тэст па беларускай або рускай мове. Таму кожны абітурыент, незалежна ад профілю выбранай спецыяльнасці, павінен валодаць дастатковым узроўнем ведаў па адной з вышэйпералічаных моў. З гэтай прычыны для кожнага будучага навучэнца ці студэнта з’яўляецца неабходнай грунтоўная падрыхтоўка па арфаграфіі, марфеміцы, граматыцы, стылістыцы і іншых лінгвістычных раздзелах.

***Мэта***

Вызначэнне найбольш аптымальных сродкаў работы па арфаграфіі беларускай мовы пры падрыхтоўцы да ЦТ з прычыны таго, што праверка ведаў па правапісе з’яўляецца адным з асноўных раздзелаў любога тэста па беларускай мове.

***Метады даследавання:*** апісальны, параўнальны.

***Вынікі даследавання і іх абмеркаванне***

Як вядома, арфаграфія — гэта “раздзел мовазнаўства, у якім вывучаюцца і распрацоўваюцца правілы аднастайнай перадачы вуснай мовы на пісьме” [1, с. 14].

Пытанні арфаграфіі займаюць адно з важных месцаў у цэнтралізаваным і рэпетыцыйным тэсціраванні па беларускай мове. Кожны год абітурыентам абавязкова прапаноўваюцца заданні па асноўных фанетычных асаблівасцях беларускай мовы, тых спецыфічных рысах, што адрозніваюць нашу мову сярод іншых славянскіх і з’яўляюцца

яе “візітнай карткай”. Гэта такія з’явы, як аканне, яканне, правапіс *ў* нескладовага, ужыванне апострафа і г. д.

Нягледзячы на зададзеную аднастайнасць тэставых заданняў па беларускай мове за апошнія некалькі год, іх тыповасць і пэўная тэматычная паўтаральнасць дыферэнцыруюцца лексічнай разнастайнасцю з абавязковым выкарыстаннем розных па структуры слоў (простых і складаных), а таксама праверкай ведання слоў-выключэнняў. Напрыклад:

**А2.** Адзначце словы, у якіх на месцы пропуску трэба пісаць літару ***я***:

1) вугл_прамысловасць;
2) з_ляніна;
3) выц_жка;
4) б_нзін;
5) сп_вачка [2, с. 4].

Ёсць заданні па арфаграфіі і ў частцы В, дзе трэба знайсці памылкова напісанае слова і запісаць яго згодна з правапісам беларускай мовы:

**В7**. Знайдзіце ў прапанаваным сказе слова, якое не адпавядае арфаграфічнай норме беларускай літаратурнай мовы. Запішыце гэтае слова правільна і ў той форме, у якой яно пададзена ў сказе:

*Восенню 1971 года пры БДУ была створана бібліяцека, якая з часам пачала выконваць функцыі галоўнай дзяржаўнай установы краіны па захаванні друкаваных і рукапісных твораў* [3, с. 26].

Акрамя заданняў па выбары літар ёсць і такія, што патрабуюць ведання адразу некалькіх правіл: сярод прапанаваных слоў (напрыклад, *каталіцтва, перакашчык, пачышчаны, капустны, нозьбітка*) трэба выбраць напісаныя беспамылкова, а для гэтага (у дадзеным выпадку) трэба ведаць такія правілы, як напісанне зычных на стыку марфем, перадача на пісьме асіміляцыі зычных, асаблівасці спрашчэння збегу зычных у беларускай мове і многія іншыя асаблівасці арфаграфіі беларускай мовы.

Такім чынам, пры адносна невялікай колькасці арфаграфічных заданняў у ЦТ (прыблізна ад шасці да дзесяці з сарака магчымых) будучы абітурыент павінен ведаць амаль што ўсе правілы напісання як галосных, так і зычных гукаў.

Таму, на нашу думку, тыпы і віды заданняў па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання павінны адрозніваецца пэўнай тэматычнай і структурнай разнастайнасцю. З гэтай мэтай аўтарам на падрыхтоўчым аддзяленні УА “Гомельскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт” выкарыстоўваецца, у асноўным, наступныя віды работы па арфаграфіі:

1. *Слоўнікавы дыктант:* тэматычны (напрыклад, па тэме “Правапіс *о, э, а* ў складаных словах”: *мовазнаўства, рознаўзроўневы, мэтазгодны, мнагапрофільны, чорнабароды* і г.д.); па блоку блізкіх тэм (напрыклад, “Правапіс зычных”: *насенне, моўчкі, паштальён, просьба, нацыскны*), змешаны (па асноўных арфаграфічных нормах у цэлым з абавязковым ужываннем слоў-выключэнняў: *менеджар, саванна* (выключэнне), *ручка-ўказка, накаўт, траур* (выключэнне), *бессістэмны, землямерны*).

Галоўная каштоўнасць такога віду работы, як слоўнікавы дыктант, у магчымасці за кароткі час праверыць веды абітурыентаў па пэўных тэмах, у шырокай разнастайнасці падбору і вар’іраванні лексічнага матэрыялу. Дарэчы, пасля напісання слоўнікавага дыктанта даволі лёгка арганізаваць як яго самаправерку, так і ўзаемаправерку з магчымасцю выстаўлення адзнак самімі абітурыентамі, што дапамагае не толькі правільна пісаць словы, але і трэніруе навык пошуку памылак.

2. *Тэкставы дыктант.* Прымяняецца пасля праходжання даволі значнага па аб’ёме тэматычнага блока (як па арфаграфіі, так і па сінтаксісе) з мэтай комплекснай праверкі ведаў. Пры жаданні тэкставы дыктант можна спалучаць з іншымі відамі заданняў (напрыклад, вызначыць стыль тэксту і абгрунтаваць свой выбар, выканаць заданне па марфеміцы, словаўтварэнні, марфалогіі і інш.), што задае высокія магчымасці сістэмнай праверкі (а таксама, самаправеркі і ўзаемаправеркі) ведаў.

Репозиторий ГомГМУ

3. *Тэставыя заданні*. З’яўляюцца найбольш лагічным прыёмам пры падрыхтоўцы абітурыентаў, таму што заданні цэнтралізаванага тэсціравання прапануюцца менавіта ў такой форме. Па змесце могуць змяшчаць заданні па адной або некалькіх (звычайна роднасных) тэмах, могуць быць прызначаны для праверкі ведаў за ўвесь школьны курс беларускай мовы. Тэставыя заданні адрозніваюцца найбольшай здольнасцю да вар’іравання і карэкцыі, таму могуць выкарыстоўвацца для вызначэння ўзроўню падрыхтаванасці практычна любога абітурыента з любым зыходным наборам ведаў. Да таго ж, тэставыя заданні дапамагаюць навучэнцу аналізаваць і параўноўваць вучэбны матэрыял, што развівае лагічнае мысленне.

Намі найчасцей выкарыстоўваюцца тэставыя заданні пасля праходжання пэўнага блока тэм (напрыклад, “Марфеміка і словаўтварэнне”, “Правапіс зычных”, “Знакі прыпынку ў складаных сказе” і г. д. ) альбо (звычайна ў другім семестры) комплексныя тэсты па розных раздзелах моваазнаўства.

Сярод іншых відаў работы па падрыхтоўцы да ЦТ можна адзначыць такія, як заданні на пераклад асобных слоў і выразаў (асабліва пры рабоце па марфалогіі і сінтаксісе простага сказа), на знаходжанне і выпраўленне памылак (пры вывучэнні арфаэпіі), на параўнанне тэкстаў з пункту погляду ўжывання пэўных моўных сродкаў. Але такія метады і прыёмы пры рабоце па выпрацоўцы арфаграфічных навыкаў з’яўляюцца другаснымі і прымяняюцца, у асноўным, пры спалучэнні некалькіх відаў работ.

***Вывады***

1. Выпрацоўка арфаграфічных навыкаў з’яўляецца адной з важнейшых складаючых падрыхтоўкі абітурыентаў да ЦТ па прычыне сваёй вядучай ролі ў граматычнай сістэме беларускай мовы.

2. Выбар аптымальных метадаў і прыёмаў для падрыхтоўкі навучэнцаў па арфаграфіі залежыць, у першую чаргу, ад узроўню абітурыентаў, тэматыкі заняткаў, плануемых вынікаў і іншых фактараў, але пры гэтым, зразумела, неабходным з’яўляецца ўмелае камбінаванне розных відаў работ.

3. З пункту погляду найбольш паспяховай падрыхтоўкі да ЦТ найлепшым прынцыпам з’яўляецца ўмелае чаргаванне і пэўная разнастайнасць відаў работы па розных раздзелах лінгвістыкі.

ЛІТАРАТУРА


1. *Кулікоўіч, У. І.* Сучасная беларуская арфаграфія. Правілы. Трэніровачныя практыкаванні. Кантрольныя работы. Заліковыя тэсты. Даведкі: вучэб. дапам. / У. І. Куліковіч. — Мінск: Новое знание, 2011. — 507 с.

2. Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова: зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск: Аверсэв, 2017. — 47 с.

3. Цэнтралізаванае тэсціраванне. Беларуская мова : зборнік тэстаў / Рэсп. ін-т кантролю ведаў М-ва адукацыі Рэсп. Беларусь. — Мінск: Новое знание, 2018. — 56 с.


**УДК 37.091.33:81’243-053.8**

## МЕТОДИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ФОРМИРОВАНИЯ ИНОЯЗЫЧНОЙ КОММУНИКАТИВНОЙ КОМПЕТЕНЦИИ У ВЗРОСЛОЙ АУДИТОРИИ


***Киселевич И. Н.***

**Учреждение образования**
**«Гомельский государственный медицинский университет»**
**г. Гомель, Республика Беларусь**


***Введение***

Структурная перестройка экономики и переход страны в новые условия рынка, увеличение объема экспорта услуг в различных сферах экономики, а также повышение



Репозиторий ГомГМУ